ЛІТАРАТУРА:
1. Бондаренко, Э. О. Праздники христианской Руси / Э. О. Бондаренко. – Калининград : Кн. изд-во, 1993. – 105 с.
2. Руднев, В. А. Обряды народные и обряды церковные / В. А. Руднев – Л. : Лениздат, 1982. – 63 с.
3. Рыбаков, Б. А. Язычество Древней Руси / Б. А. Рыбаков. – М. : Наука, 1995. – 257 с.

## У АРНАМЕНЦЕ НАША ГІСТОРЫЯ

УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
Коўш В. В., студэнт 1 курса лячэбнага факультэта
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В. І.

Арнамент – гэта найбольш вядомы від мастацкай творчасці нашага народа. Ткацтва, пашыў адзення, ганчарная справа, вышыўка – усё гэта прасякнута выкарыстаннем спецыфічнага беларускага арнаменту. Арнаменту, ідэнтычнага якому ў свеце няма. Між тым, мала хто з сучасных беларусаў ведае спецыфіку ўзораў, якія выкарыстоўваў яго народ.

Арнамент – гэта няпроста нейкі малюнак, а сымбал. Кожная дэталь арнаменту штосьці абазначае.Арнамент – гэта асаблівы ўзор. Ён складаецца з элементаў, якія рытмічна паўтараюцца і чаргуюцца адзін з адным. У выніку ўтворыцца арнаментальны шэраг. Гэта свайго роду намаляваны верш. У ім могуць прысутнічаць самыя розныя малюнкі. Але, як правіла, яны вельмі абагульненыя і схематычныя. Не заўсёды іх лёгка пазнаць.

Узоры і арнаменты – гэта цэлы свет, загадкавы і дзіўны. На іх можна глядзець доўга і кожны раз заўважаць новыя нюансы. Што такое ўзор – гэта зразумела шматлікім. Так называюць малюнак, у якім спалучаюцца паміж сабой лініі, фарбы, фігуры. Часам ідэю падказвае сама прырода – дастаткова ўспомніць марозныя галінкі на шыбе.

Народнае мастацкае ткацтва – адзін з самых пашыраных відаў народнага выяўленчага мастацтва. Але было б зусім няправільна ацэньваць яго толькі з пазіцыіі прыгажосці, арыгінальнасці арнаментыкі, каларыту. Кожны ўзор – гэта сімвал – ураджаю, працы, шчасця, святаў, павагі да продкаў, кахання.

Беларускі арнамент захаваў у сабе старажытную язычніцкую культуру і міфалогію. Шматлікія ўзоры прысвечаныя беларускім язычніцкім багам – Ярыле, Ладзе, Жыжалю, Маці-Зямлі. Калі вышывальшчыца ці ткачыха аздабляла такімі ўзорамі сваю працу – гэта азначала тое, што яна звярталася за дапамогай да гэтых багоў. Былі таксама арнаменты, прысвечаныя і святам такім, як Купалле, Каляды, Дзяды і іншыя. Цікава, яшчэ і тое, што ва ўяўленнях беларусаў гэта не пярэчыла хрысціянскай веры. Ручнік з такім арнаментам мог быць ахвяраваны ў царкву і ёю прыняты.

У беларускім арнаменце можна вылучыць некалькі асноўных матываў:

***Вобразы маці***. У тканым і вышываным арнаментах вобраз Маці сустракаецца ў трох варыянтах: у выглядзе жаночай фігуры, у выглядзе абмаляванай гірляндаю зоркі і у выглядзе схематычнага дрэва. Нярэдка вобраз суправаджаўся сімваламі сонца, месяца, агню, ветру, што падкрэслівала раўназначнасць гэтых вобразаў [1, с. 45].

***Вобразы роднай Беларусі***. Звычайна гэта быў узор скампанаваны з квадратаў і кругоў, што сімвалізавала сонца і зямлю. Існавалі таксама матывы ракі (папярэчныя палосы, якія нагадваюць рабізну на вадзе), вады (быццам кругі на вадзе, але складзеныя з прамавугольных кірпічыкаў), лесу, дубровы (звычайна некалькі радоў пазнальных матываў магутных дрэваў), поле, лугу (кветкі ўсіх магчымых колераў), жывёлаў, птуша [1, с. 65].

***Вобразы святаў.*** Вялікдзень, Купалле, Каляды, Масленіца і шмат іншых святаў знайшлі сваё адлюстраванне ў арнаментах. Выкарыстанне ручнікоў, абрусаў і іншых твораў у такія дні з такімі ўзорамі было звязана з магіяй, адмысловымі рытуаламі [1, с.83].

***Вобразы яднання песень і кветак, мелодыі і арнаменту.*** Гэтыя дзіўныя на першы погляд вобразы звязаныя з любоўю беларусаў да песень і музыкі, са звычкай пець пад час працы і адпачынку. Часцей за ўсё майстрыхі звязвалі вобраз музыкі з рознымі карункавымі вырабамі ці з выявалі кветак і птушак [1, с. 103].

***Вобразы язычніцкай міфалогіі.*** Галоўныя вобразы тут – Бог Сонца і Багіня Маці-Зямля, бо яны нарадзілі людзей і ўсю прыроду, па вераваннях старажытных славянаў. Але не былі забытыя і іншыя богі і увасабленні прыроды, такія як Дамавік, Палявік, Вадзянік, Лесавік [1, с. 113].

***Вобразы кахання.*** Тут былі сумныя вобразы жаночай долі, русалкі (апошняя досыць умоўная ўвыглядзе букета кветак) і даволі гарэзлівыя вобразы фізічнай блізкасці мужчыны і жанчыны. Распаўсюджаным арнаментам была дзяўчына з поднятымі рукамі, якая трымае каласы і кветкі – Лада, багіня кахання і прыгажосці [1, с. 131].

***Вобразы чалавека, сям'і, дзяржавы***. Сімвал чалавека васьміканцовая зорка – адзін з самых пашыраных сімвалаў у беларусаў. Бярозка ці рабіна – вобраз дзяўчыны, клён (явар) – хлопца. Сям'я – чатыры крыжападобна спалучаныя разеткі, нярэдка ў арнаментальнай аблямоўцы [1, с. 149].

***Вобразы веры.*** Перш за ўсё гэта сімвалы продкаў. На Беларусі заўсёды шанавалі дзядоў, перад памерлымі не было страху, пабачыць іх у сне не лічылася дрэннай прыкметай – наадварот – у іх прасілі дапамогі, рады, іх запрашалі на сямейныя святы. Сімвал агульнага продка – два перакрыжаваныя прамавугольнікі, унутры – маленькі крыжык. Сімвал роднага дзеда – крыж з чатырох квадратаў.

Акрамя гэтых сімвалаў у арнаментах беларусаў можна знайсці ўзоры душы (васьміканцовая разетка са скругленымі канцамі), узоры гаданняў, мараў, надзей [1, с. 181].

Як бачым, беларускі арнамент уключае ў сябе шмат розных сымбалаў.

Арнамент – гэта вялікая частка нашай, беларускай гісторыі. Нашы продкі ўкладвалі душу ў вышыванкі і ручнікі з арнаментам, якія яны рабілі на шчасце,



Репозиторий ГрГМУ

на ўраджай, на здароўе. На сенняшні дзень беларуская мова, адзенне, розныя атрыбуты становяцца больш папулярнымі, чым раней.

ЛІТАРАТУРА:

1. Кацар, М. С. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / М. С. Кацар; навук. рэд. Я. М. Сахута. – Мінск : БелЭн, 1996. – 208 с.

# ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧАСЦЬ ЯКУБА КОЛАСА

УА "Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт"
Кухнавец А. А., студэнт 1 курса лячэбнага факультэта
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В. І.

Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай.

Янка Купала

Помніцца, раней, калі я была маленькай дзяўчынкай, праводзячы амаль усе святы разам са сваёй бабуляй, па яе загадзе я прыносіла любімыя нам зборнікі твораў. Тады я не ўмела чытаць і не ведала ні аўтара, ні назву зборнікаў. Вокладкі кніг здаваліся мне не вельмі прыгожымі, але вершы і творы, змешчаныя ў іх мне падабаліся. І вось седзячы каля печы бабуля чытала мне творы. Ох, як я любіла гэты прыгожы пявучы яе голас! І цяпер, калі я пасталела гэтыя ўспаміны, здаецца, назаўсёды застануцца ў маёй памяці і будуць нагадваць мне пра тыя бесклапотныя часіны жыцця.

Праз некаторы час, прыехаўшы ў вёску, я знайшла гэты зборнік і прачытала яго назву і аўтара. Гэта быў зборнік Якуба Коласа "Голас зямлі". Імя гэтага аўтара канечне ж было мне знаёмым. Здаецца, што калі зараз выйсці на вуліцу і спытаць у простых прахожых, ці ведаюць яны Якуба Коласа, тыя без роздуму адкажуць і можа яшчэ дададуць свае пачуцці наконтага аўтара, а можа нехта і апынецца яго сваяком. І гэта не дзіва, бо жывём усе мы побач , таму што кожны беларус – гэта састаўная частка вялікай і дружнай сям'і. Усіх нас аб'ядноўвае адзінае месца жыхарства, агульная Бацькаўшчына, якую трэба любіць і аберагаць. І вось такія пісьменнікі сваімі творамі, звяртаннямі да народу сплачаюць яго, пакідаючь свайму народу асабістую "спадчыну". "Ёсць рэчы, у якія не паверыш пакуль не убачыш, але ёсць рэчы, якія не ўбачыш пакуль не паверыш". Да апошняга тыпу рэчаў адносіцца спадчына, гэта таксама і літаратурная спадчына.

У 1906 годзе адбылося станаўлення Якуба Коласа і як паэта. У першым нумары газеты "Наша доля" ён друкуе верш "Наш родны край".

Коласа абвінавачвалі ў ажыццяўленні праграмы Усерасійскага саюза настаўнікаў, скіраванай, на думку ўладаў, на падрыў грамадскага ладу Расійскай імперыі, а таксама ў складанні адозвы да настаўнікаў, якую не пісаў,